© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")

Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verlag, G.m.b.H.
München 8, Rosenheimerstr. 46 a.

Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 16 (147) Нядзеля 19 красавіка 1953 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 7

Хвальшывыя галубы міру

НОВЫЯ МАНЭЎРЫ КРЭМЛЯ

Калі яшчэ ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» пісалася на гэтым месцы аб пачатку новай «мірнай афэнзывы» Савецкага Саюзу, якую эўрапэйскі Захад пачаў быў прыймаць за чыстую манэту, дык тады савецкія верхаводы не праяўлялі яшчэ ніякай арыгінальнасьці. Гэта былі яшчэ толькі словы аб магчымасьцях мірнага існаваньня двух сьветаў, словы якія сьвет ня раз ужо чуў навет з вуснаў самога Сталіна. Але прайшло ўсяго толькі два тыдні, якія прынесьлі шмат чаго новага: гэтыя словы, тады яшчэ адзіночныя й стрыманыя, выліліся ўжо ў цэлую кампанію мірных і прыязных залётаў да Захаду. Да гэтых словаў далучыліся й чыны.

Гэтак у Савецкім Саюзе абвешчана амнэстыя, выданы дэкрэт аб чарговым зьніжэньні цэнаў, звольненыя 15 нядаўна арыштаваных лекараў, а заступнік міністра дзяржаўнай бясьпечнасьці Румін, што іх абвінавачваў у атручэньні Жданава, Шчарбакова й іншых, арыштаваны, а ягоны шэф, міністар дзяржаўнай бясьпечнасьці Ігнацьеў, звольнены за гэта із становішча аднаго зь пяцёх сакратароў ЦК камуністычнай партыі. Але найбольшай сэнсацыяй у гэтай справе было тое, што сяньняшнія ўладары Крэмля першы бадай раз у гісторыі савецкай паліцыйнай практыкі, пачынаючы ад ЧК цераз ГПУ, НКВД і да МГБ, у сувязі з гэтым прызналіся, што прызнаньне арыштаваных лекараў да ня зробленай імі віны было вымушанае недазволенымі ў Савецкім Саюзе сьледчымі мэтадамі. Ня менш цікавыя мамэнты зарысаваліся і ў вонкавай палітыцы. Гэтак у Карэі ўжо пачалася вымена хворых і раненых ваеннапалонных, а хутка маюць узнавіцца ў Панмунджоне перагаворы аб перамір'і, пры чым камуністыя выражаюць сваю згоду на адкінуты імі раней прынцып вымены ўсіх ваеннапалонных, што было, як ведама, адзінай фармальнай перашкодай дасягненьня перамір'я. Адбылося ўрачыстае прыняцьце амэрыканскіх журналістых у Маскве, падчас якога падносіліся тосты ў чэсьць Айзэнгаўэра й Маленкава. Саветы заявілі, што іхны ваенны карабель прыме ўдзел у рэвіі флёты падчас каранацыйных урачыстасьцяў у Лёндане. Зусім зьнік афэнзыўны тон прамоваў Вышынскага ў Задзіночаных Нацыях, які цяпер раптам зрабіўся мілым і дабрадушным ды гаворыць аб узаемным капаньні «тунэлю прыязьні». Справа выбару новага генэральнага сакратара ЗН, якая цягнулася ў бесканачнасьць з прычыны савецкага вэта супраць кажнага кандыдата, запрапанаванага Захадам, была разьвязана пазытыўна, таму што й савецкая дэлегацыя ахвотна прагаласавала за выстаўленага Францыяй швэцкага кандыдата. Саветы выразілі ахвоту адбыць канфэрэнцыю чатырох вялікадзяржаваў у справе задзіночаньня Нямеччыны. Як унутры Савецкага Саюзу, гэтак і на форум Задзіночаных Нацыяў спыніліся ўсякія напады на дэмакратычны Захад, навет на Амэрыку, і абвінавачваньні яго ў агрэсыўных намерах.

Вось цэлая літанія новых актаў міру й прыязьні, якая склалася ўсяго толькі на працягу некалькі тыдняў. Астаецца спадзявацца, што пакуль гэты артыкул дойдзе да чытача, гэты сьпісак значна пашырыцца і сьвет перажыве не адну яшчэ сэнсацыю.

Усё гэта ашаламіла дэмакратычны Захад, які перажывае запраўднае «галавакружэньне ад усьпехаў» і ў сваей наіўнасьці пачынае шчыра верыць у запраўдныя мірныя інтэнцыі Савецкага Саюзу, за выключэньнем толькі Амэрыкі, якая і гэтым разам знайшлася на вышыні свайго заданьня й сваей годнасьці. У той час, калі Амэрыка захоўвае стрыманасьць, цьвяроза вывучае новыя ходы савецкай палітыкі, заглядаючыся на іх вельмі сцэптычна й захоўваючы патрэбную асьцярожнасьць, эўрапэйскі Захад, перадусім Францыя й Ангельшчына, пачынае браць гэта паважна. Ангельская й француская прэса пачынае дашуквацца мірных інтэнцыяў Масквы, навет там, дзе маем зьявішчы адваротныя. Гэтак, прыкладам, калі Саветы запрапанавалі, замест дасюлешніх трох паветраных калідораў з Захаду ў Бэрлін, толькі адзін, і то такі, якім не маглі-б пралятаць вайсковыя самалёты, брытанская прэса пасьпяшалася гэта скамэнтаваць, як новы доказ мірнай ініцыятывы Крэмля. «The Sunday Times» нядаўна пісаў: «Каб спраўдзіць, ці расейскія й кітайскія гэсты ў запраўднасьці абазначаюць мір, мы самі павінны зрабіць усё, што ў нашай магчымасьці, каб надаць ім значэньне міру, сардэчна іх прыймаючы і выцягваючы зь іх усё, што толькі выцягнуць даецца». Гэтыя словы ангельскае газэты ніякіх камэнтараў не патрабуюць.

БЯЗ РУЖОВЫХ АКУЛЯРАЎ

Каб зразумець усе гэтыя гэсты й новыя манэўры савецкае палітыкі, трэба сягнуць у недалёкую мінуўшчыню Савецкага Саюзу. Зь яе пабачым, што за апошнія трыццаць год гэта ўжо трэйці падобны паварот савецкай палітыкі. Калі бальшавікі пападаюць у бязвыхаднае палажэньне, калі гарыць ім грунт пад нагамі, тады яны звычайна робяць круты й раптоўны паварот назад, адступаюць ад сваей дактрыны й тактыкі, шукаюць перадышкі, каб, умацаваўшы такім чынам сваё становішча, зрабіць потым такі-ж раптоўны паварот наперад і ня толькі адрабіць, але й надрабіць з працэнтамі страчанае. Ленінскі прынцып «шаг назад, два наперад» трэба разумець дасло́ўна.

Калі ў часы ваеннага камунізму й дамашніх войнаў краіна была аслабленая эканамічна, сярод насельніцтва падняла́ся грозная хваля незадаваленьня бальшавіцкай сыстэмай, нерасейскія народы на акраінах узмоцнілі сэпаратыстычныя імкненьні, Ленін, знаходзячыся ўжо над берагам пропасьці, павярнуў раптоўна назад сваю палітычную лінію. Быў абвешчаны НЭП — частковы паварот да капіталістычнай сыстэмы. Насельніцтва было задаволенае, ягоныя жыцьцёвыя

(Заканчэньне на 2 балоне)

ТАКІ КРОК ВІТАЕМ

Ворган групы Астроўскага «Незалежная Беларусь» (№ 3 за сакавік-красавік 1953) у вартыкуле Р. Калюша «Цынічны жарт ці правакацыя?» заняў выразнае становішча да новасьпечанае расейскімі адзінанедзялімцамі з пад знаку СБОНР-у чарговай, гэтым разам бадай найбольш непаважнай і карыкатуральнай, беларускай дывэрсіі пад назвай «Беларускае Дэмакратычнае Аб'еднаньне». Гэтае становішча зусім нэгатыўнае й варожае, якое разглядае гэты твор, як чыста расейскую адзінанедзялімскую агентуру, зложаную часткова зь небеларусаў, а часткова зь Беларусаў або зусім несьвядомых або дробных авантурнікаў, якім іхнымі пратэгаванымі была паказаная пэрспэктыва пажывіцца пры кцабаўскім карыце.

Аўтар артыкулу «Цынічны жарт ці правакацыя?» Р. Калюш, прааналізаваўшы прамову старшыні ўспомненага «Аб'еднаньня» Рэпіна, сказаную на канфэрэнцыі 1 сакавіка сёлета, ды паказаўшы на ейны дывэрсыйны характар і хвальшаваньне вачавідных фактаў, прыходзіць да наступнага выводу:

«Прыймаючы пад увагу, што мы маем дзела з чалавекам дарослым, мы схільны думаць, што ягонае выступленьне трэба разглядаць, як сьвядомую правакацыю, якая накіравана на падрыўную работу сярод беларусаў з метаю адвярнуць іх увагу ад дзейнае барацьбы супраць камунізму ды ськіраваць на нікому хіба (акрэм бальшавікоў) непатрэбны шлях змаганьня з рознага роду прахадзімцамі, «междометиями» ды агентамі.

У Польшчы такіх прахадзімцаў называюць ПОП-амі (пэлнёнцэ обовёнзэк поляка), мы-ж іх будзем зваць проста САБ...

Дарэмны таму высілак, гаспада інжынеры, дацэнты і дактары! Беларускі народ настолькі ўжо загартаваны ў сваёй 35-ці гадовай барацьбе супраць камуністычнае пошасьці, што вельмі лёгка адрозьнівае сваіх сапраўдных барацьбітоў ад розных прахадзімцаў і платных агентаў, дзеючых на шкоду беларускаму народу!»

Такое выступленьне воргану групы Беларусаў, згуртаваных вакол Беларускай Цэнтральнай Рады, можам толькі прывітаць. Хочам з гэтага цешыцца асабліва ў сувязі з тым, што яшчэ ня так даўно гэтая-ж група сама такія дывэрсіі падтрымлівала й настойліва іх абараняла, што й было галоўным пунктам разыходжаньняў, сварак і варожасьці між намі і імі. Бо навет спасярод г. зв. бэцээраўцаў ніхто сяньня ня зможа запярэчыць, што першай прычынай разьбіцьця між імі й намі былі супраць-лежныя нашыя й іхныя рэакцыі на адыход ад Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы былых беларускіх япіскапаў, якія ўліліся ў Расейскую Зарубежную Царкву і павялі выразна антыбеларускую палітычную акцыю, інсьпіраваную й кіраваную Расейцамі. Дывэрсія япіскапаў Філафея й Апанаса паводля свайго характару была зусім ідэнтычная зь сяньняшняй дывэрсіяй Асадчага й Рэпіна, але паводля сваей вагі й далейшых вынікаў была яна без параўнаньня яшчэ горшая і нягодная.

Цяперашняя дывэрсія г. зв. «Беларускага Дэмакратычнага Аб'еднаньня» ня прынесла і ня можа прынесьці, калі яно наагул будзе далей існаваць, фактычна ніякае шкоды. Уся гэтая камбінацыя была Расейцамі разьлічаная на тое, што ўдасца гэтую арганізацыю неяк спрытна падсунуць Амэрыканскаму Камітэту, які, будучы ў вялікай меры апанаваны людзьмі адзінанедзялімаўскай расейскай арыентацыі, згодзіцца ўвесьці яе ў КЦАБ, як беларускае ў ім прадстаўніцтва. Але, здаецца, Амэрыканскі Камітэт далёкі ад такой думкі. Таму той мамэнт, калі канчальна станецца ясным, што гэтаму «Аб'еднаньню» ў КЦАБ-е месца ня будзе, будзе адначасна і мамэнтам ягонае сьмерці. Мы зарызыкуем навет сказаць, што паўстаньне гэтага «тоже белорусского» твору, ня гледзячы на ўсю яго сяньняшнюю

(Заканчэньне на 2 балоне)

Палітычныя Навіны

Новая прамова прэзыдэнта Айзэнгаўэра. 16 красавіка прэзыдэнт Айзэнгаўэр на банкеце амэрыканскіх прэсавых саюзаў сказаў вялікую палітычную прамову, у якой прадставіў свой плян трывалага міру ў сьвеце. Галоўным пунктам гэтага пляну ёсьць правядзеньне агранічэньня збраеньняў і стварэньне спэцыяльнага фонду ўсімі краінамі сьвету дзеля падняцьця дабрабыту ўсіх тых, што знаходзяцца ў патрэбе й галіце. Правядзеньне такога пляну ёсьць магчымае толькі пры добрай волі Савецкага Саюзу, які свае мірныя намеры мусіў-бы паказаць не на славах, але чынамі. У першую чаргу дзеля гэтага ўважае амэрыканскі прэзыдэнт за неабходнае дасягненьне ганаровага перамір'я ў Карэі. Пасьля гэтага мусіла-б адбыцца палітычная канфэрэнцыя з мэтай правядзеньня вольных выбараў у задзіночанай Карэі, а таксама дзеля спыненьня непасрэднай і пасрэднай камуністычнай агрэсіі ў Індакітаі й на Маляях.

Вымена хворых ваеннапалонных у Карэі пачалася. На прапазыцыю камуністых дасягнута пагадненьне аб вымене хворых і раненых ваеннапалонных. 16 красавіка ўжо вырушылі з Паўночнай Карэі першыя транспарты ваеннапалонных збройных сілаў Задзіночаных Нацыяў. Хутка таксама мае быць узноўленая ў Панмунджоне канфэрэнцыя аб перамір'і. Камуністыя ўжо выразілі згоду на сыстэму вымены астальных ваеннапалонных, запрапанаваную раней Задзіночанымі Нацыямі, але адкінутую камуністымі. Амэрыканскія разьведвальныя самалёты 16 красавіка заўважылі, што разам зь першымі транспартамі альянцкіх ваеннапалонных камуністыя падцягваюць на фронт новыя збройныя сілы й узбраеньне. Гэта выклікала ў амэрыканскім кангрэсе вялікае абурэньне.

Звальненьне савецкіх лекараў. Арыштаваныя ў студзені сёлета 15 савецкіх лекараў, у бальшыні Жыды, быццам за тое, што на загад замежнай агентуры атруцілі Жданава, Шчэрбакова й намагаліся атруціць іншых савецкіх вяльможаў,былі 5 красавіка звольненыя з пад арышту. У сувязі з гэтым быў арыштаваны заступнік міністра дзяржаўнай бясьпечнасьці Румін, якому закідаецца «сеяньне варожасьці сярод савецкага народу» і «вымушаньне падчас сьледзтва прызнаньня лекараў да віны пры помачы забароненых у Саветах мэтадаў». Міністар-жа бясьпечнасьці Ігнацьеў, якому ў сувязі з гэтым закідаецца «палітычная сьлепата й латвавернасьць», быў выкінуты із становішча аднаго із пяці сакратароў цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі. Лекарцы Лідзіі Цімашук, якой за задэнунцыяваньне савецкіх лекараў быў прысвоены ордэн Леніна, цяпер гэты ордэн адабраны.

Канфэрэнцыя чатырох у Бэрліне. Ангельска-савецкія перагаворы ў Бэрліне ў справе бясьпечнасьці пералётаў ангельскіх самалётаў над Усходняй Нямеччынай на прапанову генэрала Чуйкова маюць ператварыцца ў канфэрэнцыю чатырох вялікадзяржаваў (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і СССР) у справе задзіночаньня Нямеччыны.

Новы генэральны сакратар Задзіночаных Нацыяў. Ад даўжэйшага часу Задзіночаныя Нацыі не маглі выбраць свайго генэральнага сакратара пасьля адмовы ад гэтага становішча Трыгвэ Лі, бо Саветы супраць кажнай кандыдатуры ставілі сваё вэто. Аднак апошнім часам савецкі дэлегат у Радзе Бясьпечнасьці згадзіўся на кандыдатуру швэцкага міністра замежных справаў Дага Гамарск'ёльда, які 7 красавіка 57 галасамі пры паўстрыманьні ад голасу нацыянальнага Кітаю быў зацьверджаны пленумам ЗН на новага генэральнага сакратара Задзіночаных Нацыяў.

Новая зьніжка цэнаў у Саветах. Пасьля абвешчаньня амнэстыі ў Саветах было выдадзенае распараджэньне аб зьніжэньні цэнаў на артыкулы й тавары першае патрэбы. Гэтак цана мяса зьніжаная на 15%, хлеб, мука, фасоля на 10%, баваўняныя й шоўкавыя тканіны на 15%, тканіны ваўняныя на 5%, панчох на 20%. Гэта ўжо шостая зьніжка цэнаў ад часу грашовай рэформы ў 1947 г.

Драконскі закон у Баўгарыі. У Баўгарыі ўвайшоў у жыцьцё закон, паводля якога ўсе ўцекачы з Баўгарыі, што адмовіліся або адмовяцца у будучыні павароту на бацькаўшчыну, будуць караныя сьмерцю, а іхныя сваякі карай 10 гадоў зьняволеньня.

Вялікія заварушэньні ў Аргентыне. Апошнімі днямі пачаліся ў Аргентыне вялікія беспарадкі ў сувязі з эканамічным крызысам і спэкуляцыяй, выкліканыя й падтрымліваныя апазыцыйнымі да ўраду партыямі. У сувязі з гэтым у ночы з 14 на 15 красавіка вулічная таўпа сталіцы заатакавала будынкі апазыцыйных партыяў і падпаліла іх. Гэтак былі падпаленыя будынкі сацыялістычнай партыі, радыкалаў і партыі кансэрватыстых. Таксама быў зусім спалены будынак Джокэй-клюбу з цэннымі калекцыямі кніжак і абразоў. Калі прэзыдэнт краіны Пэрон прамаўляў на адным з пляцоў Буэнос-Айрэс, былі кінутыя ў таўпу дзьве бомбы, адна зь якіх разарвалася ў вадлегласьці 150 мэтраў ад прэзыдэнта. У выніку 6 чалавек было забітых і 92 раненых.

200—300 Немцаў заяўляюцца дзённа ў армію. Нямецкі камісар абароны Блянк заявіў 14 красавіка, што ад 200 да 300 Немцаў заяўляецца дзённа ахвотнікамі ў будучую нямецкую армію, якая мае мець 12 дывізіяў. Агульная колькасьць ахвотнікаў выносіць ужо 60.000 чалавек, ня гледзячы на тое, што яшчэ няма фармальнага прыйма ў армію, так як дагавор аб нямецкай арміі патрабуе яшчэ ратыфікацыі вышшай палаты нямецкага парляманту (ніжняя палата ўжо яго ратыфікавала), а астальных 5 эўрапэйскіх дзяржаваў яшчэ наагул яго не ратыфікавалі.

Вялікія дэманстрацыі ў Тэгеране. У Пэрсыі, як ведама, ад даўжэйшага часу трывае канфлікт між прэм'ерам Мосадэкам і шахам. Камуністыя, якія заявіліся па старане Мосадэка, пастанавілі перад будынкам парляманту зарганізаваць вялікую дэманстрацыю, дамагаючыся абмежаваньня правоў шаха. Гэтая дэманстрацыя адбылася 14 красавіка, якая ператварылася ў крывавыя заварушэньні, у выніку чаго адзін камуністы быў забіты, а 20 раненых.

Адэнаўэр у ЗША. Усьлед за візытай у ЗША ангельскіх і францускіх міністраў у панядзелак 6 красавіка прыбыў у Нью Ёрк канцлер нямецкай саюзнай рэспублікі Конрад Адэнаўэр, дзе быў авацыйна вітаны амэрыканскім грамадзянствам. Адэнаўэр, які яшчэ дагэтуль знаходзіцца ў ЗША, адбыў некалькі канфэрэнцыяў з прэзыдэнтам Айзэнгаўэрам, міністрам замежных справаў Даллесам і іншымі прадстаўнікамі амэрыканскага ўраду.

Пасьля Саветаў і ў Румыніі амнэстыя. Прэзыдыюм румынскага Народнага Сабраньня выдаў дэкрэт аб амнэстыі для некаторых катэгорыяў вязьняў. Гэта амнэстыя мае між іншым абняць жанчын, якія маюць дзяцей ніжэй 7 гадоў, цяжарных жанчын і вязьняў, якім больш 60 год.

Вялікая шпіёнская афэра ў Заходняй Нямеччыне. Віцэканцлер Заходняй Нямеччыны Блюхэр асьветчыў 10 красавіка, што заходнянямецкая паліцыя раскрыла сетку савецкага шпіянажу, якая зьяўляецца найвялікшай з дасюль выкрытых на Захадзе. У сувязі з гэтым было арыштавана 35 шпіёнаў, а таксама прадбачаны далейшыя арышты. Блюхэр паведаміў, што ў шпіёнскую афэру замешаныя некаторыя міністры й вышэйшыя ўрадаўцы Усходняй Нямеччыны.

Торэз вярнуўся ў Францыю. Лідэр францускіх камуністых Торэз, пасьля двугадовай курацыі ў Савецкім Саюзе, 10 красавіка вярнуўся ў Парыж. Таўпа, зложаная зь некалькіх сотняў камуністых, зрабіла яму на станцыі ў Парыжы крыклівую авацыю.

Ціта пра Баўгарыю. У інтэрв'ю з карэспандэнтам «Юунайтыд Стэйтс Ньюс энд Уэрльд Рэпорт» маршал Ціта выказаў сваё перакананьне, што Баўгарыя, за ўзорам Югаславіі, хутка адпадзе ад савецкага блёку.

Амэрыканцы астануцца ў Карэі. Прэзыдэнт Айзэнгаўэр асьветчыў 7 красавіка, што ў выпадку, калі ў Карэі будзе дасягнуты мір, «нашыя жаўнеры і жаўнеры нашых саюзьнікаў будуць змушаныя астацца ў Карэі яшчэ на працягу даўжэйшага часу».

Паведамленьне

Ад 22 сакавіка да 2 красавіка 1953 году ў Парыжы адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў нацыянальных прадстаўніцтваў Азэрбайджану, Армэніі, Беларусі, Грузіі, Паўночнага Каўказу й Украіны. Дэлегацыя нацыянальных цэнтраў успомненых краінаў 22 сакавіка 1953 году была прынятая адміралам Стывэнсам, якому былі прадстаўленыя супольныя пазыцыі ў пытаньні супрацоўніцтва з Амэрыканскім Камітэтам Вызваленьня ад Бальшавізму.

Канфэрэнцыя ў сваей далейшай рабоце выпрацавала супольны мэмарандум, які быў пададзены Амэрыканскаму Камітэту Вызваленьня ад Бальшавізму, а таксама прыняла плян супольных дзеяньняў у справе змаганьня за вызваленьне народаў СССР і аднаўленьня іхнай дзяржаўнай незалежнасьці.

Дзеля каардынацыі сваіх дзеяньняў названыя нацыянальныя цэнтры стварылі Кантактную Камісію.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Хвальшывыя галубы міру

(Заканчэньне)

абставіны шыбка паправіліся. Нерасейскія народы атрымалі шырокія магчымасьці нацыянальнага развою. Але калі за гэты час савецкая сыстэма даволі ўмацавалася і калі міжнародная конъюнктура для Саветаў сталася вельмі спрыяльнай, Сталін раптоўна павярнуў у другі бок. Унутры краіны пачалася прымусовая калектывізацыя, ліквідацыя кулацтва й рэштак капіталізму, увесь нацыянальна творчы элемэнт нерасейскіх народаў, які за папярэдні пэрыяд выявіўся, быў бязьлітасна зьнішчаны, Камінтэрн узмоцніў у цэлым сьвеце падрыўную акцыю камуністычных партыяў.

Падобнае зьявішча мела месца і падчас апошняй вайны. Калі бальшавікі апынуліся ў грозным палажэньні й нямецкія войскі дасягнулі прадмесьцяў Масквы й берагоў Волгі, трэба было узноў зрабіць шаг назад, каб ратаваць сытуацыю. З мэтаю атрыманьня максімальнай помачы Захаду распускаецца Камінтэрн і спыняецца падрыўная акцыя пятых калёнаў, а ўнутры краіны, каб узбудзіць гэраізм у насельніцтва, дазваляецца й фаварызуецца царква, уводзяцца ўзноў ахвіцэрскія пагоны й рангі, мякчэе тэрор НКВД. Гэтымі хвальшывымі манэўрамі й акцэнтамі прыязьні Сталіну ўдалося ашукаць Захад на столькі, на сколькі ён хацеў. Захад тады паверыў, што Савецкі Саюз узапраўды эвалюцыянуе ў дэмакратычным кірунку. Гэта было галоўнай прычынай, што пасьля заканчэньня вайны Захад лёгка пайшоў на далёкія ўступкі й даў магчымасьць Савецкаму Саюзу выйсьці з вайны зь вялізарнымі трафэямі, далёка нясумернымі да ягонага ўкладу ў гэтую вайну.

Вось зусім падобнае палажэньня можам назіраць і сяньня. Пасьля сьмерці Сталіна Крэмль увайшоў у стадыю глыбокага нутранага крызісу. Дагэтуль Сталін быў непамыльным і зямным Богам. Німб ягонае вялікасьці й сілы быў непарушны. Усё нутраное жыцьцё Савецкага Саюзу й апіралася на гэтых атрыбутах асобы «вождя». Таму пасьля ягонае сьмерці мусіла сама сабой захістацца ўся сыстэма. Ягоныя наступнікі патрабуюць даўжэйшай перадышкі, каб упарадкаваць і скансалідаваць нутраныя дачыненьні, каб стварыць нейкі іншы аўтарытэт, які мог-бы замяніць аўтарытэт Сталіна. Пры гэтым ня выключаныя таксама сур'ёзныя церці на самым крэмлёўскім алімпе, аб чым могуць сьветчыць грунтоўная рэарганізацыя дзяржаўнага й партыйнага апаратаў ды частыя пэрсанальныя зьмены на вярхох. Вось гэта й мусіла выклікаць патрэбу новае тактыкі Крэмля. Але ня толькі гэта...

АФЭНЗЫВА МІРУ НА ЎСЛУГАХ АГРЭСІІ

Сяньняшняя афэнзыва міру ў Саветах хавае ў сабе ўсе азнакі далейшае агрэсіі, пры гэтым агрэсіі вельмі небясьпечнай. Гэтая агрэсія мела-б дзьве фазы: спачатку маральна й мілітарна разброіць Захад, а потым па ім ударыць.

Ужо сяньняшнія мірныя акцэнты новых уладароў Савецкага Саюзу пачалі, як было сказана, маральна разбройваць Захад. Захад Эўропы, які хоча міру за ўсякую цану, грамадзянства якога зьяўляецца падточаным ракам дэфэтызму й пацыфізму, які ў кажным савецкім гэсьце, навет найбольш аблудным, дашукваецца мірных інтэнцыяў, пачынае сяньня верыць, што Саветы пры новым кіраўніцтве ўзапраўды ня хочаць вайны і што зь імі можна ўсё-ж такі дагаварыцца. Падобнымі настроямі перапоўненая сяньня амаль уся ангельская й француская прэса.

Ад раззбраеньня маральнага, якое выразна пачалося, адзін толькі шаг да раззбраеньня мілітарнага, г. зн. да выдатнага абмежаваньня збраеньняў Захаду, які яшчэ ня ўзброіўся. Некаторыя сымптомы і такога раззбраеньня ўжо паяўляюцца. У ангельскай і францускай прэсе ўжо можна пачуць галасы аб патрэбе зьмяншэньня падаткаў на абарону і аб скарачэньні тэрміну вайсковай службы. Падобна ў ЗША гаворыцца ўжо аб новым мірным бюджэце прэзыдэнта Айзэнгаўэра. Небясьпека можа праявіцца ў тым, што падобныя настроі могуць мець свой адмоўны ўплыў на ратыфікацыю дагавораў аб эўрапэйскай арміі.

Вышэй была мова аб тым, што Саветы выказваюць жаданьне канфэрэнцыі чатырох вялікадзяржаваў у справе задзіночаньня Нямеччыны. Ня выключана, што ў справе нямецкай Крэмль можа пайсьці на далёкія ўступкі, бо яму гэта аплачваецца. Калі-б ён, прыкладам, згадзіўся на вольныя выбары ў цэлай Нямеччыне, дык справа эўрапэйскай арміі гэтым самым была-б пахаванай. А пакуль у гэтай справе вяліся-б перагаворы, у якіх Саветы маніфэставалі-б сваю «добрую волю», справа гэтая цягнулася-б узноў у бесканечнасьць.

Паколькі, аднак, Амэрыка глядзіць на ўсе гэтыя манэўры Масквы трэзва і старалася-б астуджваць давер эўрапэйскага Захаду да савецкіх прапановаў, дык клін разыходжаньняў між Амэрыкай і Эўропай мог- бы моцна паглыбіцца. Трэба не забывацца, сколькі Амэрыка мусіла націскаць на Ангельшчыну, каб прымусіць апошнюю абмежаваць свой гандаль з чырвоным Кітаем.

З гэтага бачым, што новыя «мірныя» ходы Крэмля не зьяўляюцца нічым новым. Яны зьяўляюцца пасьлядоўнай рэалізацыяй палітыкі, устаноўленай яшчэ на XIX зьезьдзе камуністычнай партыі з удзелам самога Сталіна. Тады, між іншымі, былі вызначаныя наступныя мэты палітыкі Савецкага Саюзу на найбліжэйшую будучыню: давесьці да адарваньня Заходняй Эўропы ад Амэрыкі, пакрыжаваць пляны ўзбраеньня Заходняй Нямеччыны, не дапусьціць да стварэньня эўрапэйскай арміі і захістаць існаваньне самога Атлянтычнага пакту. Новыя ўладары Крэмля аказаліся сяньня вернымі вучнямі Сталіна.

Камуністычныя прапановы перамір'я ў Карэі зусім не пярэчаць гэтым савецкім канцэпцыям. Справа ў тым, што Саветы, а перадусім чырвоны Кітай, маглі сур'ёзна спалохацца цьвёрдай і энэргічнай паставы прэзыдэнта Айзэнгаўэра ў карэйскім пытаньні. Яны ведаюць, што Айзэнгаўэр, верны свайму прыраченьню, зробіць усё, каб гэтую вайну ганарова для Амэрыкі скончыць. Пэрспэктыва збройнай інтэрвэнцыі пры амэрыканскай помачы Чан-Кай-Шэка зусім ня ўсьміхаецца Мао-Тсэ-Тунгу. Саветы ведаюць, што калі Айзэнгаўэру ня ўдасца закончыць вайны мірнымі сродкамі, ён будзе змушаны ўжыць сілы. Калі-ж Саветы яшчэ ня чуюцца на сілах адкрыта ўмяшацца ў такую вайну, тады перамога Амэрыкі загарантаваная. Такое заканчэньне разьдзьмуханага Саветамі карэйскага канфлікту вельмі адмоўна адбілася-б на савецкім прэсьціжы й непамерна зьменшыла-б іхныя ўплывы ў вольным сьвеце. Дык ці-ж ня выгадней ім пры такой сытуацыі на дзеле паказаць свае мірныя інтэнцыі якраз у Карэі і давесьці да заканчэньня гэтае вайны пры найвыгаднейшых для сябе абставінах. Гэтым яны нязвычайна многа маглі-б выйграць палітычна. Тады іхныя імкненьні ў кірунку маральнага раззбраеньня Захаду, а гэтым самым, пэўне-ж, і мілітарнага, мелі-б вялікі пасьпех. Дык ці не аплаціцца тады ім пасьвяціць Карэю дзеля заманлівай пэрспэктывы выйграць у іншым месцы?

Глыбейшая аналіза цяперашняй савецкай палітыкі паказвае, што ўсе крэмлёўскія галубкі міру, якіх пачалі яны сяньня масава выпускаць на Захад, зьяўляюцца вельмі-ж хвальшывымі. Захад зробіць непрабачальную памылку, калі дасьць сяньня патрэбную Саветам перадышку. Калі вораг часова аслаб, але астаецца пэўным, што потым рушыць ізь сьвежай сілай, дык трэба па ім біць, не даючы гэтай перадышкі, біць усюды, а найбольш там, дзе яму найбольш баліць. А найбольш балючым для бальшавікоў месцам гэта палітыка вызваленьня, так шумна распачатая нядаўна Задзіночанымі Штатамі, а цяпер, на жаль, дыскрэтна зложаная ў архіў.

Язэп Каранеўскі

Такі крок вітаем

(Заканчэньне)

нэгатыўнасьць, можа быць у будучыні для Беларусаў навет карысным. Дзякуючы яму прынамсі ўжо сяньня выявіліся, як сьлед, тыя нямногія спасярод Беларусаў адзінкі, на якіх ня толькі нельга будзе разьлічваць, калі настане мамэнт апошніх выпрабаваньняў, але што ад іх трэба будзе як найдалей стараніцца, бо яны заўсёды будуць там, хто ім болей дасьць.

Дывэрсію-ж былых беларускіх япіскапаў мусім разглядаць у зусім іншай роўніцы. Яна першая выклікала падзел беларускага эміграцыйнага грамадзянства на два варожыя лягеры, унесла поўную дызарыентацыю сярод масаў беларускіх праваслаўных вернікаў, была прычынай бязупынных сварак і ўзаемных абвінавачаньняў, абсэрбавала нашую эміграцыю ад пазытыўнай нацыянальнай працы. І трэба было шмат энэргіі, вялізарных намаганьняў, каб аднавіць беларускую аўтакефальную праваслаўную герархію, каб япіскапаў, якія хацелі ўсю нашую эміграцыю пацягнуць за сабой пад апеку «старэйшага брата», поўнасьцю ізаляваць ад беларускага грамадзянства і абясшкодзіць.

А людзі, што гуртуюцца сяньня вакол Беларускае Цэнтральнае Рады, якраз былі тады фанатычнымі абароньнікамі такой палітыкі (даслоўна палітыкі, якая ня мела ўжо нічога супольнага ані з царквой ані з рэлігіяй) япіскапаў, ня толькі перашкаджалі нам у выкрываньні ейнае антыбеларускасьці, але за гэта найвастрэй нас атакавалі. Вось чаму апошняе выступленьне «Незалежнай Беларусі» супраць новай, але такой самай паводля свайго характару,дывэрсіі, пры гэтым выступленьне яснае й станоўчае, нам астаецца толькі прывітаць. Нам хацелася-б верыць, што выступленьне гэтае ня будзе фактам адзіночным, але вызначыць сабой усю далейшую палітыку ўспомненай групы.

Нядаўна паявіўся ў «Бацькаўшчыне» артыкул «Як дасягнуць каардынацыі беларускае эміграцыі?», аўтар якога, А. Сьвіслацкі, прапануе поўнае пагадненьне між Беларусамі, што гуртуюцца вакол БНР з аднаго боку і БЦР — з другога, ды паказвае спосабы практычнага правядзеньня такога пагадненьня. «Незалежная Беларусь» у тым-жа самым нумары выступае з артыкулам Кузьмы Забужаніна «Каардынацыя й пагадненьне», у якім таксама абараняецца гэтая каардынацыйная й пагадняльная канцэпцыя, толькі даюцца зусім іншыя на яе рэцэпты. На наш пагляд, і адзін і другі аўтар выходзіць з хвальшывага гледзішча, і адзін і другі хацеў-бы гэтае пагадненьне правесьці чыста мэханічным спосабам. Каб дасягнуць запраўднага пагадненьня ці каардынацыі, павінна быць найперш створаная дзеля гэтага ідэалягічная база, і то ня база, выпісаная ў праграмах абедзьвюх групаў, бо гэтыя праграмы амаль аднолькавыя (усе-ж «стаяць» на Акце 25 Сакавіка), але яна павінна быць паказаная ў практычнай дзейнасьці. Бо ані справа вызнаваньня першага ці другога кангрэсу, ані справа асобаў прэзыдэнтаў была прычынаю сяньняшняга падзелу. Падзел пачаўся яшчэ тады, калі БЦР, пасьля самаліквідацыйнага паседжаньня 25 верасьня 1945 г. пад Вюрцбэргам, уважала сябе разьвязанай, а ейны прэзыдэнт з поўных прычынаў быў тады вонках усякай палітычнай дзейнасьці на эміграцыі. Падзел, — яшчэ раз паўтараем — быў запачаткаваны вясной 1946 году дывэрсіяй япіскапаў. Канкрэтна ён зарысаваўся пасьля зьезду праваслаўных Беларусаў 5 травеня 1946 г. у Рэгензбургу, калі бальшыня нашага грамадзянства, пераканаўшыся аб тым, што япіскапы ня вернуцца назад да Беларусаў і пойдуць расейскім адзінанедзялімскім шляхам, заняла да іхнае палітыкі нэгатыўнае становішча, а мяншыня асталася пры япіскапах пры ўсякай іхнай палітыцы. Потым да паглыбленьня гэтага падзелу далучыліся прычыны іншыя, якія або выплывалі зь першай, аснаўной прычыны, або паўставалі із самага факту варожасьці абедзьвюх групаў, або, напасьледак, былі ўнесеныя сьвядома ці несьвядома ўсякімі цёмнымі авантурыстычнымі й амаральнымі элемэнтамі, якіх ахвотна прыймала ў рады свае група, што сяньня падтрымлівае БЦР.

Дзеля гэтага ўважаем, што калі гэтая першая й аснаўная прычына, што непасрэдна выклікала ўспомнены падзел і пасеіла ўзаемную варожасьць, ужо адпала, то ў сьлед за ей павінны былі-б адпасьці і ўсе прычыны іншыя, часамі ня менш важныя за першую, і тады толькі можа быць знойдзеная гэтая супольная база для паразуменьня, супрацоўніцтва, каардынацыі дзеяньня, а навет і поўнага задзіночаньня. Бяз гэтайжа базы прапанаваць сяньня чыста мэханічныя спосабы пагадненьня й каардынацыі шляхам пасыланьня дэлегатаў у існуючыя або ў ад гок твораныя ўстановы, шляхам розных выбараў ці перавыбараў, гэта значыць гаварыць у пустую.

Алесь Крыга

Зьмена назвы Амэрыканскага Камітэту

У канцы сакавіка сёлета «Амэрыканскі Камітэт для Вызваленьня Народаў Расеі» зьмяніў сваю назву на «Амэрыканскі Камітэт для Вызваленьня ад Бальшавізму».

У сувязі з гэтым старшыня гэтага Камітэту адмірал Стывэнс 25 сакавіка выдаў спэцыяльны прэсавы камунікат, у якім між іншым чытаем наступнае:

«Камітэт паўстаў у штаце Дэлявэр 8 лютага 1951 году пад назвай «Амэрыканскі Камітэт Свабоды для Народаў СССР». Некалькі месяцаў пазьней ягоная назва была зьмененая на «Амэрыканскі Камітэт для Вызваленьня Народаў Расеі». Прычыны, якія прывялі да цяперашняй зьмены, зьяўляюцца наступныя:

Камітэт прыняў раней назву «Амэрыканскі Камітэт для Вызваленьня Народаў Расеі» таму, што яна ў яркай форме выясьняла амэрыканскаму грамадзянству, якія ёсьць ягоныя мэты й прычыны існаваньня. У разуменьні перасечнага Амэрыканца, які глыбей неабзнаёмлены з этнаграфічнымі праблемамі ў СССР, словы «Народы Расеі» адносяцца да тых народаў, якія сяньня ўваходзяць у склад Савецкага Саюзу. У разуменьні Амэрыканцаў такая тэрміналёгія служыць выключна утылітарным мэтам і ня мае ніякага палітычнага значэньня для нацыянальнага пытаньня ў сярэдзіне СССР.

Камітэт быў добра пра тое паінфармаваным, што многія — часта ўзаемна варожыя — элемэнты сярод эмігрантаў з Савецкага Саюзу з розных прычынаў глядзелі на гэтую назву зь незадаваленьнем і падазрэньнем. Намаганьні зьмяніць гэтую назву на іншую **давалі добрую нагоду для шавіністычных агентаў баламуціць тыя пазытыўныя колы эмігрантаў, якія ўзапраўды хацелі задзіночыць усе свае высілкі ў антыбальшавіцкім змаганьні** (Падкрэсьленьне нашае — Рэд.).

Камітэт ужо раней паказваў на тое, што мамэнт непаразуменьня між ім і эміграцыяй на такім фоне узьдзержываў ад супрацоўніцтва з Камітэтам тыя

(Заканчэньне на 3 балоне)

ЯНКА КУПАЛА (9)

ТУТЭЙШЫЯ

(Заканчэньне)

НАЧАЛЬНІК. Добрае так сабе... Вашы дакумэнты!

МІКІТА. Якія — старыя, ці новыя? Старыя во дзе ў гэтых партфэльчыках. (Паказвае на прынесеныя к таму часу Гануляй партфэлі).

НАЧАЛЬНІК. Старыя потым раскумекаем, — давайце новыя.

МІКІТА. (Пакапаўшыся ў кішэнях і за пазухай, на бок). Оей, оей! Польскі дакумэнт трэба паказваць. Каб я лепей скрозь дна праваліўся! (Дастаўшы дакумэнт з-за пазухі, да Начальніка). Во ён, гэты, меджду протчым, дакумэнт. (На бок). Каб яго калядны пярун спаліў!

НАЧАЛЬНІК. (Разглядаючы дакумэнт). Польскі?

МІКІТА. Зусім польскі і з усіх бакоў польскі. (На бок). Каб яго за Буг вынесла, меджду протчым!

НАЧАЛЬНІК. Хто можа прачытаць?

СЬПІЧЫНІ. Пазвольце, таварыш, я прачытаю. (Чытае). «Оказіцель нінейшэго Нікіціуш Зносіловскі служы пшы Комісарыяце поліцыі мяста Мінска, яко доносіцель».

МІКІТА. «Яко розносіцель», Гэнры Мотавіч!

СЬПІЧЫНІ Паложым, не «яко розносіцель», а «яко доносіцель», — чорнае на белым стаіць.

НАЧАЛЬНІК. Пераклумачце дакумэнт.

СЬПІЧЫНІ. «Пакасчык гэтага, Нікіцій Зносілов, служыць у Менскім Камісарыяце паліцыі даношчыкам».

МІКІТА. «Разношчыкам», Гэнрых Мотавіч!

СЬПІЧЫНІ. Не «разношчыкам», а даношчыкам», — чорнае па беламу стаіць, гражданін Зносілов.

МІКІТА. Вы, мусье прафэсар, кепска прачыталі і кепска пераклумачылі.

СЬПІЧЫНІ. Паложым, я ніколі кепска ня чытаю і кепска ня тлумачу, глядзеце самі, гражданін рэгістратар!

МІКІТА. (Чытаючы). До... до... до... ноносіцелем. Оей, оей. Як-жа гэта вышла? Я сам пісаў, сам рукою ўласнай пісаў, а начальства подпіс дало і не прачытала, мабыць, Гэнрых Мотавіч! Як-жа гэта вы мяне вучылі, меджду протчым?

СЬПІЧЫНІ. Паложым, пры чым тут мая навука, калі вы самі пераблуталі «до» з «роз»-ам. А можа вы й ня пераблуталі?

МІКІТА. Увесь Менск ведае, што я служыў разношчыкам, а не даношчыкам.

НАЧАЛЬНІК. Ну, досыць, пасьля разьбяром! (Да Мікіты). Хто тут з вамі яшчэ знаходзіцца?

МІКІТА. Гэта, меджду протчым, мая мамаша, а гэта і гэна, як іх? — мае госьці.

НАЧАЛЬНІК. (Да Спраўніка і Дамы). Вашы дакумэнты. (Прыгледзеўшыся). І вы, здаецца, мае старыя знаёмыя? Во цёплая кампанія. (Дама і Спраўнік кляняюцца і аддаюць свае дакумэнты).

НАЧАЛЬНІК. (Да Сьпічыні). Прачытайце.

СЬПІЧЫНІ. У гэтым напісана: «рэвіровы сюдмэго рэвіру мяста Мінська».

НАЧАЛЬНІК. Што гэта знача?

СПРАЎНІК. «Акалодачны надзірацель сёмай часьці места Менску», гаспадзін таварыш.

НАЧАЛЬНІК. (Да Патрульнага). Зрабеце рэвізію кішэняў гэтага грамадзяніна.

ПАТРУЛЬНЫ. (Робіць рэвізію, знаходзіць у кішэні Спраўніка пагоны і падае іх Начальніку).

НАЧАЛЬНІК. (Круцячы пагоны, ў руках, да Спраўніка). Што гэта?

СПРАЎНІК Спраўніцкія пагоны, гаспадзін таварыш: памятка былога вялічча.

НАЧАЛЬНІК. (Палажыўшы пагоны на стол, да Сьпічыні). Чытайте другі дакумэнт.

СЬПІЧЫНІ. (Чытае). «Баронэса Шпацэрзон, ганаровы член Менскай дабрачыннасьці».

НАЧАЛЬНІК. Шпацэрзон... Шпацэрзон... Ну, усё роўна, — пойдзе і яна. А цяпер, калі рэвізія скончана, прашу ўсіх ісьці са мной. (Да Ганулі). Вы, цётка, застаіцёся хаты пільнаваць.

МІКІТА. Оей! Оей! Што, і мне йсьці, мусье таварыш?

НАЧАЛЬНІК. А вы думалі як?

МІКІТА. Оей! Оей! Пакіньце мяне. Нашто я вам, меджду протчым, патрэбен? Вось у гэтых партфэлях зусім што іншае аба мне сказана. Зірнеце ў гэтыя паперы, ваша таварыскасьць. Як прачытаеце, то ўсё роўна не забярыцё мяне, меджду протчым.

НАЧАЛЬНІК. Усё роўна не магу йначай. Гэтыя пісталеты, награбленая гарэлька, патака, цяганьне чужых рэчаў, служба даношчыкам, усё гэта для нас таксама добрыя паперы, хоць для вас, можа, і дрэнныя паперы.

МІКІТА. Дык пакажэце мне, меджду протчым, ваша чырвонае благародзіе, чэк на мой арышт.

НАЧАЛЬНІК. Чэк атрымаеце, як прыдзеце на месца. Ідзем! Прашу забіраць «вешчэственныя даказательства». (Начальнік забірае рэвальвэры, адзін партфэль і пагоны. Даме, Спраўніку, Грамадзяніну і Сьпічыні дае несьці па пары бутэлак, Мікіце — патаку, двум Патрульным — па партфэлю). А цяпер — марш за мной!

МІКІТА. Оей! Оей! Ваша таварыская міласьць! Пакіньце мяне з мамашай. Меджду протчым, пайду памагаць вам забіраць Варшаву, толькі не забірайце мяне!

ГАНУЛЯ. Мае паночкі, мае галубочкі! Хаця ня зьмікіцьце майго Мікіткі. Хаця ня зьмікіцьце! (Апускаецца зь ціхім плачам на спакаваныя манаткі. Усе, апрача яе, выходзяць. Пры апошніх Гануліных словах за вокнамі на вуліцы разлягаецца харавая песьня).

Ой ты, яблочко,
Куда коцішся?
Не туда попадзёш —
Не вароцішся...

Пасьля паўмінутнай паўзы, пад нясьціхаючыя гукі песьні, паволі апускаецца

ЗАСЛОНА
КАНЕЦ

Акопы, 31. VIII. 1922 г.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Водгукі Сакавіковай Гадавіны

За прыкладам мінулых гадоў і сёлета была вельмі ўрачыста адсьвяткаваная 35-ая гадавіна абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ўва ўсіх больших і меншых асяродзьдзях расьсяленьня беларускае эміграцыі ў вольным дэмакратычным сьвеце. Факт гэты сьветчыць, што нашая эміграцыя зьяўляецца глыбака патрыятычнай і стаіць непахісна на грунце беларускае дзяржаўніцкае ідэі, зь якога ня зыйдзе ў ніякіх абставінах свайго жыцьця. Ніжэй зьмяшчаем прысланыя нам справаздачы з абходзінаў гэтага найвялікшага нашага нацыянальнага сьвята, прысланыя нам толькі зь некаторых пунктаў нашага расьсяленьня.

25-га Сакавіка у Рыме

Сёлета Цэнтраля Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на Чужыне сьвяткавала ўрачыста 35-ую гадавіну абвешчаньня Незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі ў Рыме. Дзякуючы ініцыятыве а. Татарыновіча, прадстаўніка ЦБАА на Італію, гэная арганізацыя мела нагоду нятолькі адсьвяткаваньня ў Рыме нашага вялікага нацыянальнага сьвята, але й навязаньня пры гэтай акалічнасьці цясьнейшых дачыненьняў з акадэміцкімі коламі Італіі.

Беларуская калёнія ў Рыме невялікая, але дзякуючы энэргіі, настойлівасьці й арганізацыйным здольнасьцям а. Татарыновіча яна даволі моцная на рымскім палітычным грунце. Усе цяжкасьці й клопаты ў сувязі з арганізацыяй урачыстасьці ляжалі практычна на плячах а. Татарыновіча.

Дзень 25-га сакавіка пачаўся ўрачыстай Богаслужбай у слаўным каталіцкім касьцеле Санкта Франчэска Романа пры Форум Романум недалёка ад руінаў Колёсэум. На Богаслужбе былі прысутнымі, апрача беларускай калёніі і шматлікіх прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, Апостальскі Візытатар для Украінцаў Яго Эксцэленцыя Бучка і Яго Эксцэленцыя Вінцэнто Падолькіс, япіскап летувіскі. У часе Богаслужбы сьпяваў ведамы ўжо беларускаму грамадзтву на эміграцыі, а таксама артыстычным колам Рыму лірычны артысты-бас Пётра Конюх.

Пасьля Богаслужбы ўсе прысутныя сабраліся ў залі манастыра, які знаходзіцца побач успомненай сьвятыні, дзе ведамы прыяцель Беларусаў Бэльгіяц а. Робэрт ван Каўвэлерт прывітаў гасьцей і зрабіў маленькі даклад, у якім даў гістарычнае асьвятленьне Акту 25-га Сакавіка. Гаворачы пры гэтым аб беларускіх студэнтах у Лювэне, як першай крыніцы пазнаньня ім беларускага пытаньня, ягоны голас дрыжэў і хваляваўся.

«Беларусь у той час была для мяне няведамым паняцьцем, — гаварыў ён — я ўзяў карту й шукаў яе на карце. Сяньня, калі я пазнаў беларускую моладзь, ейны бязьмежны ідэялізм і адданасьць для вялікай ідэі, я пазнаў Беларусь і я веру, я перакананы ў няўміручасьць іхнай Бацькаўшчыны і яе Ўваскрашэньня». Вялікая сьляза скацілася па ягоным твары. Ён зэлектрызаваў прысутных, ён іх загіпнатызаваў сваей верай у Беларусь, ён іх заразіў сваей адданасьцю для беларускай справы. Пасьля дакладу а. Робэрта госьці былі запрошаныя на чарку лікёру і добрага італьянскага віна «Лякрыма Хрысьці», што пабеларуску абазначае «Хрыстовая Сьляза».

Вечарам у вялікай залі Гранд Готэлю (адзін з найвыстаўнейшых гатэляў Рыму) мела месца другая частка праграмы. А. Татарыновіч прывітаў гасьцей паітальянску і прадставіў старшыню ЦБАА др. Б. Рагулю, які прачытаў у францускай мове рэфэрат на тэму 25-га Сакавіка. Італьянскі пераклад быў загадзя прыгатаваны і коратка перад дакладам разданы ўсім тым, хто не разумеў францускай мовы.

Пасьля рэфэрату пачалася мастацкая частка. Першай выступіла ліцэнцыятка лювэнскага ўнівэрсытэту сп. Людміла Рагуля зь дзьвюма народнымі песьнямі: «Дуброва» й «Ой сяду я ў панядзелак» у вапрацоўцы сьв. пам. М. Равенскага. Тыпова народны жанр выкананых песьняў, які дасканала гарманізаваў з прыгожай нацыянальнай вопраткай сьпявачкі, выклікаў вельмі прыемнае ўражаньне. Пасьля яе выступіў наш славуты бас Пётра Конюх. Ён сьпяваў дзьве песьні: адну італьянскую «О Бацькаўшчына» і другую беларускую — «Жыў на сьвеце Лявон». Здавалася замерла заля, калі раздаўся ягоны магутны бас. Зазьвінелі крышталы, замерла душа ў слухачоў. У іх вочах вычувалася пытаньне: адкуль вы яго ўзялі? Хто ён? Так, гэта адзін з нашых Лявонаў, «якія яшчэ не пазводзіліся», як гавораць слевы гэтае песьні. Гэны Лявон, Пётра Конюх, мо' ўжо ў недалёкай будучыні сусьветная слава, рыхтуецца сяньня да турнэ, каб будзіць беларускай песьняй сумленьне Захаду й зацікавіць яго беларускай справай. Мы верым, што ён гэта зрэалізуе... «Эх, Лявоны яшчэ не пазводзяцца» — гучыць яшчэ сяньня ў нашых вушах гэтая Купалава песьня. Пасьля сп. Конюха выступіла артыстка мілянскай опэры «Скаля» сп. Ліція Россіні Корсі — сопрано, якая была на гэтым вечары нашым госьцем. Акампаньявалі сп. Рагулі сп. Ніна Боручыя, дачка сусьветнай славы баса, выкладчыца рымскай кансэрваторыі, і сп. Конюху прафэсар кансэрваторыі і ягоны-ж настаўнік сп. Корсі.

Пасьля мастацкай часткі пры багатым буфэце госьці заатакавалі прысутных Беларусаў рознымі пытаньнямі. Сп. Цьвірка й Сп. Рагуля, якія былі ў нацыянальных вопратках, хутка сталіся цэнтрам усяе ўвагі. Прэлегэнт а. Татарыновіч, а. Робэрт, а. Тарасэвіч, малады студэнт тэалёгіі Садоўскі, а. Маскалік, які прыехаў на гэтую ўрачыстасьць зь Нямеччыны, былі засыпаныя пытаньнямі. Сакратар бэльгійскай амбасады Мээнс прыабяцаў абавязкава наведаць беларускіх студэнтаў у Бэльгіі. Праф Маніні зь міністэрства асьветы прасіў спатканьня дзеля дакладнейшага абзнаямленьня зь беларускім пытаньнем. Др. Энрыко Інсабато, дырэктар цэнтру італя-арабскіх узаемадачыненьняў, падзяліўся з намі сваімі ўражаньнямі зь першых кантактаў з дыпляматамі БНР у 1918 г. у Швайцарыі. Ён нам абяцаў напісаць у «Бацькаўшчыну» артыкул на гэтую тэму. Прадстаўнікі паняволеных бальшавізмам народаў жыва выказвалі сваё задаваленьне зь бліжэйшага кантакту зь Беларусамі. Няпрысутнымі былі толькі Расейцы й Палякі. Сумна, але камэнтары хіба лішнія. У часе пачастунку сп. Конюх прасьпяваў яшчэ некалькі беларускіх народных, італьянскіх і францускіх песьняў. Карэспандэнт зь «Фігаро» не даваў яму супакою, просячы яго сьпяваць што найбольш беларускіх песьняў. Разьвітваючыся, усе госьці выказвалі сваю радасьць і вялікае задаваленьне з праведзенага супольна зь Беларусамі вечару.

На наступны дзень беларуская грамада з удзелам а. Робэрта арганізавала супольны абед. Сьвежыя ўражаньні з удалага вечару, узаемныя падзякі, народныя песьні, ды ўсё гэта пры шклянцы італьянскага віна, стварылі нязвычайна сымпатычную атмасфэру. Апошнія дні свайго побыту ў Рыме сп. сп. Рагуля й Цьвірка прысьвяцілі афіцыяльным візытам дзеля замацаваньня навязаных кантактаў. Пажадана, каб урад ЦБАА кажны год ладзіў такія сьвяткаваньні ў розных краінах. Гэта дасканалы спосаб дзеля нацыянальнай прапаганды ды навязваньня кантактаў зь інтэлектуальным сьветам паасобных народаў.

С. Т.



Др. Б. Рагуля пры чытаньні рэфэрату ў Грант Готэлі й фрагмэнт залі із слухачамі.



Пётра Конюх выконвае беларускія песьні пры акампаньяманце праф. Корсі.

«БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА»

З пасярод многіх рымскіх газэтаў, якія зьмясьцілі прыхільныя водклікі аб беларускім нацыянальным сьвяце ў Рыме, на асаблівую ўвагу заслугоўвае артыкул, зьмешчаны пад вышэйшым загалоўкам у ваднэй з найпаважнейшых італьянскіх газэтаў «Іль Тэмпо» (№ 85 за 26. 3. 1953), які зьмяшчаем поўнасьцю ніжэй бязь ніякіх камэнтараў, бо ягоную вартасьць для нашай нацыянальнай прапаганды ацэняць самі чытачы.

«У Гранд Готэлі рымскія Беларусы сьвяткавалі сваё нацыянальнае сьвята з прамовамі й песьнямі. Адна з найпышнейшых заляў гэтай гасподы была ўпрыгожаная вялікімі бел-чырвона-белымі сьцягамі. Сьцягі гэтыя, казаўбы, насьвежа былі зладжаныя і нарыхтаваныя, каб несьці й разгарнуць іх над Менскам, Віцебскам, Смаленскам, Вільняй ды Берасьцем-Літоўскім, уздоўж Беразіны й Дняпра, на ўзьбярэжжы 3.500 вазёр, панад вяршалінамі соснаў і дубоў векавых непраходных пушчаў таго краю, які так ня церпіць Расейцаў.

Беларусы ня хочаць і слухаць аб бальшавікох, а перадусім аб маскалёх. Усёроўна — царыстых ці камуністых. Расейцы — гэта сынонімы прыгнятальнікаў усіх выгнаных Беларусаў, расьцярушаных па сьвеце й тужліва чакаюых шчасьлівага дня вызваленьня іхнае краіны. На выгнаньні вось яны сьвяткуюць 25 Сакавіка, бо ў гэтым дні 35 гадоў таму назад была абвешчана й прынятая народам беларуская канстытуцыйная грамата. Потым, у 1918 годзе 25 сакавіка, прысяжныя радныя, выбраныя на Ўсебеларускім Кангрэсе із 1872 дэпутатаў 17—31 сьнежаня 1917 г., абвесьцілі Беларускую Народную Рэспубліку, якая шасьцю эўрапэйскімі дзяржавамі была прызнаная дэ юрэ, а многімі — дэ факто. Але чырвоныя крамлёўскія разбойнікі, ня могучы сьцерпіць адраджэньня беларускай незалежнай дзяржавы, на загад Сталіна, тагачаснага «камісара меншасьцяў», напусьцілі на Беларусаў узброеную сібірскую банду. Яна абступіла дом Кангрэсу зьнячэўку й намагалася разагнаць яго, арыштоўваючы перадавых дэпутатаў. Разгараецца пасьля вайна між Беларусамі й Расейцамі-бальшавікамі, у першых выніках якое апошнія былі адкінутыя на 100 кілямэтраў. Пасьля аднак гэтай першай перамогі й абвешчаньня незалежнасьці Рэспублікі Устаўною Граматаю, Беларусы атрымалі ўдар у плечы ад Палякаў. Перашкоджана такім чынам маладой Беларускай Рэспубліцы разьвіць сваё функцыянаваньне над 18 мільёнамі жыхарства (у 70% праваслаўныя і ў 25% каталікі), расьселенага на тэрыторыі ў 380.000 кв.клм. І так вось пабліталіся яшчэ раз сны Беларусі, загрожанай з паўночнагаўсходу расейскай 900-кілямэтровай мяжой, з захаду 330-кілямэтровай з Польшчай і Прусіяй, з паўдня-ж 760-кілямэтровай граніцай з Украінай, а з паўночнага захаду народамі балтыцкімі.

Ад пазьнейшых пагромаў і рэпрэсіяў бальшавіцкіх зьгінула каля 500 людзей навукі, 70 паэтаў і пісьменьнікаў, каля 600 журналістых і палітычных дзеячоў, 20.000 інжынераў, мэдыкаў, вучыцялёў, мастакоў, студэнтаў; а з народных масаў дэпартавана каля 3 мільёнаў сялянства й работніцтва, варожага да агіднай саветызацыі. Гэная масакра была да таго страхотная, што Прэзыдэнт Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, Мікола Абрамчык, апіраючыся між іншым і на знойдзеных афіцыяльных дакумэнтах савецкіх, апублікаваў у лістападзе 1950 г. у Торонто (Канада) адну кніжку, абвінавачваючую Крэмль за гэносыдызм свайго народу.

Духоўныя з доўгімі бародамі, зыходзячыся ў залю Гранд Гатэлю ў Рыме, пазіралі мэлянхолійна на ягоны сплендор, мабыць сумавалі ў думках па вынішчаным беларускім духавенстве. У песьнях адчуваліся шэпты-скаргі пушчаў шумлівых ды прытоеных балотных хваляў. Вялікія рэкі й азёры мігацелі ў вачох, загледжаных на палымнеючыя чырваньню й бельлю сьцягі, зьвісаўшыя з аднае сьцяны гатэлю. Недабіткі гэносідызму на Беларусі, побач з Украінцамі, Грузінамі ды іншымі каўкасцамі й народамі, прыдушанымі Крамлём, ахвяры тужлівага чаканьня — вось вымова сяньняшняга Гранд Гатэлю; вымова пад акампаньямант прыглушанай трамтадрацыі аркестры й воплескаў із суседняе залі, дзе старыя матроны адпраўлялі культ моды на інтэнцыю аднае фірмы, падбіваючы гэткім чынам ахвоту фрывольным мадысткам чваніцца напоўголымі хвігурамі....

Дастойныя ў паважных строях і настроях духоўнікі — побач вось гэткага лёгкадумства «вольнае Эўропы». Які-ж балючы кантраст!»

Д. П.

Святкаваньне у Лендане

Нашае агульнае нацыянальнае сьвята дае нагоду кажным разам сабраць усе свае сілы, каб з радасьцю й пасьпехам перажыць той узапраўды Вялікі Акт абвешчаньня Незалежнай Беларускай Рэспублікі.

Гэтым разам Беларусы ў Лёндане ня ладзілі акадэміі, не гаварылі вершаў, але тым ня менш правялі нацыянальны дзень так, як кажнаму шчыраму Беларусу дыктуе ягоны патрыятызм.

Загадзя для справы правядзеньня Дня 25 Сакавіка прычыніўся Каардынацыйны Камітэт Беларускіх Арганізацыяў у Вялікабрытаніі, сябрамі якога зьяўляюцца ЗБВБ, ЗБК і БХАА «Жыцьцё». Камітэт гэты выбраў адумысловую камісію, якой было даручана зарганізаваньне ўрачыстасьці. Пастаноўлена было зрабіць у Беларускім Доме ў Лёндане дня 25 сакавіка прыняцьце як для сваіх сяброў Беларусаў, гэтак і для чужынцаў, якім былі разасланыя ў ангельскай мове запросіны.

Каля гадзіны восьмай вечарам зыходзіцца госьці ў толькі што адноўлены Беларускі Дом. У вадным канцы залі ўжо чакаў гасьцей багаты буфэт і напіткі, а ветлівыя Беларускі стараліся ўгасьціць кажнага. У хуткім часе забралася ў залі звыш 60 чалавек. Пасьля нейкага часу старшыня Каардынацыйнага Камітэту папрасіў усіх прысутных заняць месцы. У простых шчырых словах прывітаў ён гасьцей і падзякаваў за іхнае прыбыцьцё. З нагоды сьмерці каралевы Марыі злажыў кандаленцыю ў першую чаргу прысутным спадарыням і спадаром Ангельцам. Адчытаў таксама тэлеграму, якая была высланая ад імя Каардынацыйнага Камітэту на рукі каралевы Альжбеты II. Хвілінай цішыні была ўшанаваная сьмерць каралевы Марыі. У далейшым у сваей прамове зьвярнуў увагу на розьніцу ў змаганьні з камунізмам паміж Беларусамі й Расейцамі: Беларусы змагаюцца супраць камунізму і за незалежнасьць, тады калі Расейцы антыкамуністыя нічога ня мелі-б супраць, каб, ськінуўшы камунізм, у далейшым паняволіць шматлікія народы. Калі і ёсьць сярод Расейцаў сям-там шчырыя дэмакраты, дык яны, на жаль, належаць да рэдкіх выключэньняў.

Пасьля сп. Курыла прывітаў усіх у беларускай мове, заканчываючы моцным і наважаным «Жыве!» ў чэсьць БНР.

Трэйцім прамоўцам быў сп. Вэбстэр, ангельскі дзеяч з партыі кансэрватыстых. Гэта першы выпадак на гэтым востраве, калі мы маглі пачуць Ангельца, які зь сілай перакананьня стаў у вабароне незалежнасьці Беларусі. Гаварыў ён, як прыватная асоба, але прастудыяваў нашую праблему, ведае добра нашыя імкненьні. Ён даўжэй застрымаўся на прыродных багацьцях Беларусі і акце абвешчаньня яе незалежнасьці. У канцы сваей прамовы ён пажадаў, каб ужо наступнага 25 Сакавіка Беларусы сьвяткавалі ў сваім родным Менску. Заўважым, што на залі было шмат яшчэ Ангельцаў і ўсе яны вельмі часта далучалі да слоў сп. Вэбстэра сваё «heare», «heare» (ангельскі спосаб выяўленьня згоды ў парляманьце або на мітынгах).

Пасьля віталі Беларусаў: ад Чэхаў генэрал Прхаля, ад Украінцаў (УНРады) праф. Сэмчышын, ад Палякаў інж. Сьцібор-Рыльскі, рэдактар часапісу «Ідзе-мы» і праф. Славінскі, ад Грузінаў сп. Гугушвілі, ад Славакаў др. Прыдавок, ад Летавісаў сп. Трылупайціс. Некаторыя запрошаныя госьці не маглі быць прысутнымі, але яны пераслалі свае прывітаньні. Між іншымі пераслаў свае прывітаньні др. Гаўрыловіч, Сэрб — старшыня Каардынацыйнага Камітэту Арганізацыяў Самапомачы ў Вялікабрытаніі і Старшыня Югаславянскага Камітэту. Баўгарскі Камітэт дэлегаваў сваю рэпрэзэнтантку.

Кажны з успомненых тут чужынцаў жадаў беларускаму народу хуткай перамогі на змагарным шляху да сваей незалежнасьці. Пасьля прамоваў узноў вольная гутарка, сяброўскі настрой, беларускія песьні. Сярод прысутных былі прафэсары ўнівэрсытэту, людзі з вайсковым стажам, палітычныя дзеячы, журналістыя. Усе яны шчыра нам дзякавалі за прыгожы вечар.

Ідэя Незалежнай Вольнай Беларусі разыходзілася шырэй і далей, прыспарвала нам сяброў сярод Ангельцаў, нашых гаспадароў.

Ч. С.

(Заканчэньне ў наступным нумары)

Зьмена назвы Амэрыканскага Камітэту

(Заканчэньне)

групы, якія маюць усе дадзеныя на тое, каб прылучыцца да антыбальшавіцкага змаганьня. **Камітэт думае, што гэтая назва, якую ён цяпер прыняў, усуне труднасьці, якія стаялі на шляху да дасягненьня ягонае мэты».** (Падкрэсьленьне нашае — Рэд.).

Чытаем, дзівімся й вачам сваім ня хочам верыць. Няўжо нешта падобнае мог сказаць адмірал Стывэнс пасьля заканчэньня сваей інспэкцыі ў Эўропе, дзе ён меў магчымасьць дакладна пазнаёміцца з запраўднымі прычынамі, чаму аўтарытэтныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў станоўча адкінулі палітычную плятформу КЦАБ-у й адмовіліся ў яго ўступіць?

Што напасьледак Амэрыканскі Камітэт атрымаў сваю запраўдную назву, шчыра вітаем, як таксама шчыра вітаем звальненьне сп. Аляксандра із становішча палітычнага рэфэрэнта эўрапэйскага аддзелу Амэрыканскага Камітэту, які адкрыта паддзержываў імпэрыялістычныя тэндэнцыі расейскіх арганізацыяў у КЦАБ-е. Але ніяк ня можам вітаць думкі адмірала Стывэнса, што аўтарытэтныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў, якія ён называе «пазытыўнымі коламі эмігрантаў», не ўвайшлі ў КЦАБ толькі таму, што «шавіністычныя агенты» баламуцілі іх гэтай назвай. З гэтага далейшы вывад, што ўсе тыя дывэрсанты й авантурнікі спасярод нерасейскіх народаў, усе іхныя палітычныя фікцыі, часамі ад гок створаныя, што ўліліся ў КЦАБ, гэта запраўдныя й аўтарытэтныя прадстаўнікі нерасейскіх народаў, якія маюць тую вышэйшасьць над першымі («пазытыўнымі коламі эмігрантаў»), што не даліся абаламуціць «шавіністычнымі агентамі».

Таксама нас дзівіць пагляд адмірала Стывэнса, што толькі зьмена назвы Амэрыканскага Камітэту «ўсуне труднасьці, што стаялі на шляху да дасягненьня ягонае мэты». Аднэй зьмены назвы яшчэ мала, як таксама недастаткова яе было пры зьмене назвы СОНР-у на КЦАБ. Для гэтага патрэбна яшчэ, каб супольны з Расейцамі антыбальшавіцкі цэнтр, над змантаваньнем якога звыш двух год безрэзультатна працуе Амэрыканскі Камітэт, ня служыў для імпэрыялістычных пасяганьняў Расейцаў на нерасейскія народы, а таксама каб была загарантаваная роўнасьць і раўнапраўнасьць у ім усіх партнэраў і была выключаная дамінацыя Расейцаў.

Хочам верыць, што Амэрыканскі Камітэт у мэтах зарганізаваньня змаганьня з бальшавізмам узыйдзе на гэты шлях.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Ці можам быць незадаволенымі?

ДРУКУЕЦЦА Ў ПАРАДКУ ДЫСКУСІІ

У сувязі з прызнаньнем Беларусі як раўнапраўнага сябры Задзіночаных Нацыяў беларуская праблема набрала міжнародне вагі. Беларускім народам, ягогонай культурай, мовай, літаратурай, мастацтвам і ўсімі ягонымі другімі духовымі набыткамі сталі цікавіцца чужыя вучоныя. Гэтак у 1951 годзе Г. А. дэ Брэй, лектар сучаснай славянскай філялёгіі і ўсходня-эўрапэйскіх студыяў Лёнданскага Ўнівэрсытэту апублікаваў «Праваднік для Славянскіх Моваў» («Guide to the Slavonic Languages». Publ. by J. M. Dent & Sons Ltd. London—New York, 1951), у якім нашай мове прыдзелена ня меней месца і ўвагі, што і ўсім іншым славянскім мовам.

У тым-жа годзе адзін з найпапулярнейшых і найбольшых унівэрсытэтаў ЗША — Калюмбійскі Ўнівэрсытэт у Нью Ёрку апублікаваў географію СССР («Geography of the USSR a regional survey». By Theodore Shabad, Columbia University Press, 1951), у якой зьмешчаны агульны геаграфічны агляд і нашае Бацькаўшчыны, як Беларусі, а так-жа й паасобны агляд усіх 12 сучасных адміністрацыйных акругаў Беларусі. Гэтым-жа ўнівэрсытэтам у мінулым годзе быў выдадзены «Геаграфічны Слоўнік Сьвету», у якім пададзеныя ўсе геаграфічныя назовы ў межах сучаснай адміністрацыі БССР. Навет пры слове Беласток паясьняецца, што ён належаў да Беларусі і толькі пасьля апошняй вайны перайшоў у склад Польшчы.

У гэтым-жа самым годзе Італьянец праф. Джузэппэ Мэссіна апублікаваў у Флярэнцыі ў італьянскай мове навуковую працу аб беларускай літаратуры, а ўжо ў лютым бягучага году іншы італьянец, У. А. Флёрыдзі напісаў грунтоўную аб ей навуковую рэцэнзію, якую надрукаваў у лютаўскім нумары навуковага рымскага часапісу «La Civilta Cattolica».

Можна было-б яшчэ шмат чаго прывесьці з чужаземных навуковых працаў пра Беларусь, але гэты мой артыкул мае зусім іншую мэту.

Нашая крытыка найбольш нэгатыўна паставілася да таго, што аўтары, пішучы свае працы, карысталіся выданьнямі Савецкай Беларусі і ў сувязі з гэтым беларускія тэмы часта асьвятлялі з савецкага гледзішча. І тут паўстае вельмі важнае пытаньне: ці мог ангельскі аўтар Дэ Брэй, пішучы сваю працу «Праваднік да Славянскіх Моваў», карыстацца якімі-колечы моваведнымі выданьнямі нашай паваеннай эміграцыі? І тут трэба з прыкрасьцю сьцьвердзіць, што не!

Бо як нам усім добра ведама, за выключэньнем «Падручніка крывіцкае (беларускае) мовы» Др. Я. Станкевіча, якім ніхто з нас, апрача самога аўтар, не карыстаецца, мы нічога (!) абсалютна ня маем, з чаго маглі-б скарыстаць замежныя навукоўцы, пішучы пра нашую мову. А што-ж тычыцца ўспомненага адзінага «падручніка», дык у нас навет ніхто не хацеў яго і рэцэнзаваць, бо, як пісаў парыскі часапіс «Божым Шляхам» у нумары 6 (9) за чэрвень 1948 году, «пісаць рэцэнзію на гэты падручнік можна было-б падвойна: або пішучы рэцэнзію, напісаць запраўдны падручнік сучаснай беларускай мовы, высказваючы пры гэтай нагодзе фантастычныя выдумкі аўтара, або — коратка парадзіць аўтару даць больш правільны назоў падручніку, якім ён ёсьць у запраўднасьці — «Падручнік перакручанае беларускае мовы».

А можа нехта мяркуе, што замежныя вучоныя павінны былі выкарыстаць пэрыёдыкі нашых замежных друкаў? То ён тады тут найбольш мыляецца! Як мы самі бачым, у нас на эміграцыі што часапіс дык і мова! А ў некаторых такая штучная й поўная рэдактарскай выдумкі, як у «Ведзе», «Зьнічу» ці аўстралійскім «Новым Жыцьці», што чытаючы дзіву дзівуешся, як яе такую й маглі прыдумаць. Гаворачы аб праблеме мовы замежнай Беларусі мусім канкрэтна сьцьвердзіць: яна ў нас тут яшчэ «не ўпарадкаваная» ці, яшчэ канкрэтней, мы ўсе тут не аднэй і тэй самай мовай карыстаемся! І гэта вытварае той хаос, зь якога ніводзін паважны, цэнячы сваю веду, замежны вучоны не жадае карыстацца.

У запраўднасьці, здаровым розумам спытаймася самі сябе: якую мову замежнай Беларусі чужы вучоны можа ўзяць за аснову сваей навуковай працы? Ці навукова-літаратурнага часапісу «Веда», беларускага рэлігійна-грамадзкага часапісу «Зьніч» і далучанай да яго Эвангеліі й перакладу «Кво Вадзіс» Г. Сенкевіча, ці часапісаў «Шыпшына», «Сакавік», «Запісы», «Божым Шляхам», «Моладзі», «Бацькаўшчыны», «Беларус», «Беларускі Эмігрант» і цэлы рад другіх часапісных і кніжных выданьняў? Нашая здарова думаючая галава скажа ясна, што гэтых апошніх. Чужынец-жа гэтым не захоча ламаць сабе галавы і з гэтае прычыны карыстаецца казённымі выданьнямі Савецкай Беларусі.

Таксама нам нельга высказваць свайго нездаваленьня што да чужых перакладчыкаў нашае літаратуры за тое, што яны не скарысталі з твораў і літаратурных жаролаў замежнай Беларусі. Лепш паставім сабе пытаньне: з чаго можа даведацца, хочучы напісаць паважны твор, чужы перакладчык пра нашую літаратуру? Якое літаратурнае выданьне нашай сучаснай эміграцыі ёсьць адпаведнае і годнае ўвагі для замежнага перакладчыка? Літаратурныя часапісы «Сакавік», «Шыпшына», «Баявая Ўскалось» ці сучасны месячны літаратурны дадатак газэты «Бацькаўшчыны»? Пытаньне вельмі важнае і на яго цяжка адказаць. Аднак, разважыўшы, можна сьцьвердзіць, што да гэтага не падыходзіць ніводнае ўспомненае выданьне? Хто з паважных аўтараў-перакладчыкаў захоча мадзець над рататарным выданьнем «Баявой Ускалосі» ці зьбіраць з газэты «Бацькаўшчыны» ейныя «Літаратурныя дадаткі», пры чым з поўнай адсутнасьцю нашай рэчовай літаратурнай крытыкі? Хіба ніхто! Праўда, яшчэ ёсьць некалькі выдадзеных зборнікаў вершаў, зь якіх можна было-б карыстаць, але адкуль іх чужынец можа дастаць? Дзе ёсьць той адрас, на які зьвярнуўшыся, можна было-б атрымаць нашае выданьне?

І з гэтых прычынаў мы ня маем ніякага маральнага права выяўляць свайго нездаваленьня, што замежныя навукоўцы карыстаюцца выданьнямі Савецкай Беларусі!

Калі мы хочам апраўдаць нашае цьверджаньне (а я думаю, што так!), што тут вольная Беларусь, што тут яе мозг, то мы ў дзялянцы гэтае Беларусі, у галіне ейнае літаратуры неабходна павінны безадкладна выдаць заплянаваную яшчэ на Бацькаўшчыне Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры ў Вільні, а таксама й заплянаваную на эміграцыі часапісам «Шыпшына» анталёгію беларускае літаратуры, якую можна было-б запрапанаваць чужынцам, як нешта адменнае ад казённых выданьняў Савецкай Беларусі. Таксама неадкладна трэба было-б выдаць (як ходзяць чуткі ўжо напісаную А. Адамовічам) гісторыю беларускай літаратуры за апошніх 50 год. Пры ўсім гэтым трэба было-б прыступіць і да выдаваньня новых твораў, напісаных нашымі паэтамі й пісьменьнікамі за апошнія гады на эміграцыі.

Мікола Вярба

Агульны Зьезд СББ

У гэтым годзе звычайны агульны зьезд СББ прыпаў якраз у той час, калі некалькі дзён таму назад ён, як і ўся беларуская эміграцыя, страцілі лепшага сына свайго народу, майстру народнай песьні сьв. пам. праф. М. Равенскага. Традыцыйным звычаем, распачынаючы ўсякую працу, адбылася Божая Служба. Гэтым разам удзельнікі, што прыбылі на зьезд, маліліся за супакой душы адыйшоўшага ў вечнасьць дарагога свайго сябры. Малебен адпраўлялі два сьвятары БАПЦ: а. Аўген і а. Аляксандар, які прыбыў з Ангельшчыны.

Пасьля абеду адбылася афіцыяльная частка зьезду, які адкрыў дасюлешні старшыня СББ а. А. Смаршчок. Пасьля гэтага быў выбраны прэзыдыюм зьезду — сп. Ю. Сенькоўскі — старшыня і сп. сп. Т. Цімафейчык і М. Булыга — сябры.

З прывітальнымі прамовамі выступілі ад Згуртаваньня Беларусаў у Вялікай Брытаніі а. А. Крыт і ад Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне сп. А. Арэшка.

З агульнай дзейнасьці СББ за мінулы год справаздачу здаў старшыня а. А. Смаршчок. Формы дзейнасьці галоўнай управы не зьмяніліся, хоць сама дзейнасьць значна зьменшылася з увагі на эміграцыю многіх сяброў СББ з Бэльгіі ў іншыя краіны. Культурна-асьветны рэфэрэнт Саюзу сп. В. Кіпель правёў 12 рэгулярных зборак сяброў, што пражываюць на правінцыі. У нясеньні душпастырска-сацыяльнай апекі а. Смаршчок зрабіў 40 выездаў на правінцыю, зь іх 10 чыста сацыяльнага характару. Управа брала ўдзел у паседжаньні Бэльгійскага Камітэту для Ўцекачоў, а таксама ў канфэрэнцыі Міжнароднай Фэдэрацыі Хрысьціянскіх Работнікаў Уцекачоў і Эмігрантаў. Было выдана тры нумары «Інфармацыйнага Бюлетэню» пры ахвярнай дапамозе сп. сп. А. Марговіча і В. Шчэцькі. Грашовыя даходы складаліся галоўным чынам зь сяброўскіх складак, якія аплачваліся досыць нерэгулярна. Усяго ўплыло 8.745 франкаў. Сальдо на дзень зьезду складае 1.069 франкаў. Рэвізыйная Камісія сьцвердзіла поўны парадак у вядзеньні карэспандэнцыі, а таксама ўліку сяброўскіх складак, за што вынесла падзяку скарбніку СББ сп. М. Ягаўдзіку. Стараньнем ураду СББ быў арганізаваны фонд дапамогі хворым. За час свайго дзеяньня ад 1 верасьня 1952 г. ён разьвіў акцыю дапамогі ня толькі ў Бэльгіі, але і тым пакрыўджаным лёсам ДП, што не змаглі выэміграваць зь Нямеччыны. Да акцыі дапамогі таксама прычыніліся некаторыя прыяцелі Беларусаў спасярд Бэльгійцаў. Да дня зьезду было сабрана 8.239 франкаў. Дзейнасьць гэтая разьвілася дзякуючы ахвярнай працы сп. сп. М. Шуста і А. Міцкевіча. На асаблівую ўвагу заслугоўвае праца прэсавага прадстаўніка на Бэльгію сп. В. Барысэвіча. Ён паставіў працу так, што блізу ўсе сябры рэгулярна выпісваюць беларускую прэсу й аплачваюць належнасьць за яе. За час ад 1 кастрычніка 1952 г. да дня зьезду за прэсу паступіла 3.336 франкаў. Тут беларускія газэты рассылаюцца заўсёды ў той самы дзень, калі яны прыходзяць. Пры гэтым трэба адзначыць ахвярную дапамогу сп. З. Савёнак — выдатнай памочніцы ў выкананьні тэхнічнай працы пры рассылцы.

Праслухаўшы справаздачу зь дзейнасьці выканаўчых ворганаў СББ, распачалася дыскусія ў справе ўдзяленьня абсалюторыюм уступаючай управе. Справа ня выглядала-б так скамплікавана, каб не адвечнае «каб». Усё стала на мёртвым пункце, калі дайшло до сацыяльнага рэфэрэнта, які ня толькі ня выканаў усіх сваіх абавязкаў у часе кадэнцыі, але пад уплывам «буржуазнае мэнтальнасьці» ня прыйшоў навет на зьезд. Улічыўшы гэта, зьезд вынес абсалюторыюм старой управе, за выключэньне сацыяльнага рэфэрэнта сп. М. Смалонскага.

Далей зьезд прыступіў да выбараў новых кіруючых ворганаў Саюзу. На прапанову сп. П. Барысіка зьезд праз аклямацыі выбраў паўторна старшынёй СББ а. А. Смаршчка. У склад ураду былі яшчэ выбранымі: заступнікам старшыні сп. А. Шацько, сакратаром сп. Ю. Сенькоўскі, скрабнікам сп. А. Міцкевіч. Функцыі сацыяльнага рэфэрэнта ўзяў на сябе сп. В. Шчэцька. У рэвізійную камісію выбраныя: сп. сп. М. Арцюх, П. Барысік і В. Жыбурт.

Пасьля заканчэньня выбараў была парушаная справа радыяперадачаў у беларускай мове. Урад згадзіўся заняцца гэтай справай і выслаць адпаведныя лісты ў дырэкцыю радыя «Голас Амэрыкі і ў міністэрства замежных справаў ЗША з дамаганьнем аб прызнаньні голасу й Беларусам. Улічваючы ахвярную працу фонду помачы хворым, зьезд папрасіў сп. сп. М. Шуста і А. Міцкевіча прадаўжаць і надалей сваю дзейнасьць. Дзеля нясеньня лекарскае дапамогі хворым работнікам сп. др. Б. Рагуля даў згоду быць афіцыяльным лекарам пры СББ.

Так у паднятай атмасфэры і ў зразуменьні тых заданьняў, што стаяць перад кажным беларускім эмігрантам, прайшоў шосты агульны зьезд Саюзу Беларусаў Бэльгіі, які закончыўся пад гукі нашага нацыянальнага гымну.

А. Шацько

ХУТКА ВЫЙДЗЕ З ДРУКУ
АСОБНАЙ КНІЖКАЙ П'ЕСА Ў 4-ох ДЗЕЯХ ЯНКІ КУПАЛЫ

«Тутэйшыя»

з абшырным крытычным нарысам ведамага беларускага літаратуразнаўца Р. СКЛЮТА.

Цана аднэй кніжкі ў ЗША і Канадзе 1 даляр. Ува ўсіх іншых краінах раўнавартасьць аднаго амэр. даляра. Ужо можна прысылаць заказы разам з належнасьцю ў Нямеччыне на Адміністрацыю «Бацькаўшчыны», а ў іншых краінах на нашае Фінансавае Прадстаўніцтва ў Бэльгіі паводля наступнага адрасу:
Janka Zučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

БЕЛАРУСЫ ПАМАГАЮЦЬ ДЫЗЭРТЫРАМ З ЧЫРВОНАЕ АРМІІ

Радыё «Голас Амэрыкі (расейскі сэктар) перадало 11 красавіка згодна паведамленьняў перабежчыкаў, што дэзэртырства чырвонаармейцаў з вайсковых частак, раскватараваных у Беларусі, прыняло масавыя разьмеры, асабліва з частак Бабруйскага й Слуцкага гарнізонаў.

Згодна гэтых паведамленьняў дызэртыраваўшыя чырвонаармейцы ўцякаюць у бліжэйшыя лясы, дзе далучаюцца да партызанцкіх аддзелаў, якія складаюцца, як падае радыё, пераважна(?) зь беларускай моладзі. Партызанскія аддзелы папаўняюцца, — гаворыць далей радыё — уцёкшымі вязьнямі з канцлягераў у Бабруйску й Слуцку. Гэтыя партызаны нападаюць на камуністычных дзеячоў, камуністычныя ўстановы, асабліва на г. зв. іспалкомы.

Аблавы на партызанаў аддзелаў МГБ не даюць жаданых вынікаў, бо мясцовае насельніцтва ня супрацоўнічае з бальшавіцкімі ўладамі, але аказвае выдатную помач партызанам, дастаўляючы ім прадукты харчаваньня й заўсёды паведамляючы аб аблавах на іх.

29-га сакавіка 1953 году памёр у горадзе Пэкрыт наглай сьмерцю пасьля трагічнага выпадку

СЬВЯТОЙ ПАМЯЦІ

МІХАЛ ШАСТАК

народжаны 21 жнівеня 1923 году ў Вераскове, Навагрудчына, аб чым у вялікім суме паведамляе Галоўная Ўправа Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі.

АГУЛЬНЫ ЗЬЕЗД СЯБРОЎ ЗБВБ

Гэтым падаецца да ведама, што 7-мы Агульны Зьезд Сяброў Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі адбудзецца 25 і 26 красавіка 1953 г. ў Беларускім Доме ў Лёндане, 52, Penn Road, London. N. 7.

Зьезд пачнецца ў суботу 25. 4. 53 а 5-ай гадзіне па паўдні.

Беларусы на навуковай канфэрэнцыі ў США

У суботу 21 сакавіка ў Нью Ёрку адбылося выступленьне Д-ра Ўладзімера Сядуры на Амэрыканскай Навуковай Канфэрэнцыі Мюнхэнскага Інстытуту па вывучэньню гісторыі і культуры СССР. Д-р Сядура выступіў зь вялікім навуковым дакладам на тэму — БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА І ТАТАЛІТАРЫЗМ.

У дакладзе былі асьветлены шляхі разьвіцьця ўсіх галінаў беларускае культуры — мастацтва, тэатру, літаратуры за апошнія 3 дзесяцігодзьдзі. Упяршыню перад амэрыканскім сьветам быў намаляваны шырокі абраз беларускага адраджэньня ў першым дзесяцігодзьдзі пасьля рэвалюцыі. Для мала або зусім неабазнанае ў пытаньнях беларускае культуры аўдыторыі было навіной даведацца аб існаваньні колькіх сот беларускіх пісьменьнікаў і паэтаў, колькіх літаратурных згуртаваньняў, паважных часапісаў, вялікай колькасьці мастакоў, скульптараў, артыстых, рэжысэраў і кампазытараў, навукоўцаў і прафэсуры ў розных галінах навуковае культурна-асьветнае дзейнасьці. Амэрыканцы былі глыбака ўзрушаны, калі дакладчык перайшоў да наступнага этапу змаганьня партыі з нацыянальна-вызвольным рухам на Беларусі, вынікам якога было зьнішчэньне бадай усіх прадстаўнікоў нацыянальна-адраджэнскай плыні ў беларускай літаратуры. 500 без аднаго зьнішчаных маладнякоўцаў, бальшыня ліквідаваных полымянцаў і ўзвышэнцаў прагучэлі моцным абвінаваўчым актам супраць крамлёўскай тыраніі і тэрору ГПУ-НКВД.

На падставе фактаў дакладчык давёў, што формула Сталіна, — азначэньне культуры, як нацыянальнай толькі па форме і сацыялістычнай па зьместу, — пазбаўляе беларускую культуру магчымасьці вольнага разьвіцьця і робіць яе зброяй таталітарнага ладу. На прыкладах беларускай літаратуры дакладчык паказаў, як усё-ж такі ніколі ня спынялася адчыненае ці прыхаванае змаганьне за свабоду, нацыянальную і чалавечую годнасьць Беларусаў.

Навуковая пэрыядызацыя беларускае культуры атрымала зразуменьне і адобраньне з боку многіх удзельнікаў канфэрэнцыі і засьветчана выказваньнямі праф. Карповіча і Р. Дабрыніяна, рэдактара армянскага трохмесячніка.

Акрамя ўсяго, у дакладзе было ўзьнята і асьветлена колькі пытаньняў што выступленьне д-ра Ул. Сядуры і сп. Ан. да характарыстыкі сучаснага стану культуры народаў пад савецкім панаваньнем. Сыстэма прымусовай сталінскай кананізацыі, што прыводзіць гэтыя культуры да творчага застою, была прааналізаваная на прыкладах найноўшых твораў драматургіі.

Аб цікавасьці, якую выклікаў даклад д-ра Сядуры сярод амэрыканскіх колаў, сьведчаць ня толькі гучныя воплескі, якімі аўдыторыя надарыла яго выступ, але і той факт, што колькі амэрыканскіх газэт зьвярнулася да дакладчыка з просьбай даць ім тэкст для шырэйшага асьвятленьня ўзьнятых праблемаў у друку.

Даклад д-ра У. Сядуры запісваўся на фанографе і будзе зьмешчаны ў працах канфэрэнцыі.

Яшчэ ў канфэрэнцыі браў удзел сп. Антон Адамовіч, які выступіў двойчы з кароткімі заўвагамі адносна праслуханых дакладаў і падаў колькі сваіх думак што да закранутых праблем.

Удзел двух Беларусаў-навукоўцаў на Амэрыканскай Канфэрэнцыі вельмі пасьпяхова прычыніўся да справы належнага рэпрэзантаваньня беларускае справы ў сьвеце.

Прысутны

БЕЛАРУСКАЯ МОВА ПРЫЗНАНАЯ ЗА ЭГЗАМІНАЦЫЙНЫ ПРАДМЕТ У ЛЁНДАНСКІМ УНІВЭРСЫТЭЦЕ

Як падае газэта «Украінская Думка», што выходзіць у Лёндане, беларуская й украінская мовы ўключаныя да эгзамінацыйных прадметаў у Лёнданскім унівэрсытэце. У распараджэньні ўнівэрсытэту для генэральных эгзамінаў (General Certicate of Education Examinations) гаворыцца: «Правілы генэральных эгзамінаў на 1953 год. Дадатак да правілаў генэральнага эгзаміну на 1953 год. Лёнданскі ўнівэрсытэт, балона 24. Зацемка: Украінская й беларуская мовы зьяўляюцца даданымі да сьпіску моваў, якія можна прапанаваць пры эгзаміне на звычайнай ступені».

Гэты сьпісак абыймае 72 мовы, зь якіх, улічваючы беларускую і ўкраінскую, можна прапанаваць толькі 32, як эгзамінацыйны прадмет.

ШУКАЮЦЬ

Усіх сяброў і знаёмых з Клецку й раёну **Драгаўца Валодзю, Бубна Івана, Калько Аляксандра, Цімаўца Барыса** і іншых, якія пражывалі ў Ангельшчыне, шукае **М. Кірсанаў.** Весткі слаць на адрас: M. Kirsanow, 14 Holborm Ave., Leig, Lanes. England.

АДКАЗЫ РЭДАКЦЫІ

Сп. А. Р. у Ангельшчыне: Прысланы Вамі верш «Пасланьне Старшым Брацьцям» ня можа быць зьмешчаны з прычынаў чыста тактычных, хаця сам па сабе гэты верш добры й да друку падходзіць.

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны"

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:**
   Mr. Borysevic, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:**
   The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.
3. **У Францыі:**
   Vladimir Symanec, 47 Bld, de Bezons Sartrouville (S. et O.) France
4. **У З Ш А:**
   Mr. B. Danilovich, 222 Suydam St. New Brunswick, N. J. U.S.A.
5. **У Канадзе:**
   Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:**
   Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:**
   Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:**
   Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:**
   Mr. Karanieuski Marian, 88, Hercules Drayve, Roxburgh-Hydro New-Zealand.

*

ЦАНА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. ЗША	15 цэнтаў
2. Канада	15 цэнтаў
3. Вялікабрытанія	1 шылінг
4. Францыя	40 франкаў
5. Аўстралія	1 шылінг
6. Аргентына	2 пэзо.
7. Бэльгія	5 франкаў

Ува усіх іншых краінах раўнавартасьць 15 цэнтаў ЗША за 1 эгзэмпляр.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011